ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
25.06.2021 № 99

РЭКАМЕНДАЦЫІ
па складзе і парадку распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеныя Рэкамендацыі падрыхтаваны ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры і вызначаюць асноўныя патрабаванні да ўсталявання мяжы тэрыторыі нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – гісторыка-культурная каштоўнасць) пры яе наяўнасці, зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці, іх межаў і рэжымаў іх утрымання і выкарыстання, а таксама склад, парадак распрацоўкі і зацвярджэння праектаў зон аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей.

2. Праект зон аховы гісторыка культурнай каштоўнасці (далей – праект зон аховы) – тэхнічны нарматыўны прававы акт, які складаецца з тэкставай і графічнай частак і змяшчае асноўныя звесткі аб гісторыка-культурнай каштоўнасці і прылеглым да яе асяроддзі, апісанне межаў прынятых зон аховы, рэжымы ўтрымання і выкарыстання тэрыторыі ў межах зон аховы.

3. Праект зон аховы распрацоўваецца для забеспячэння захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх навакольнага асяроддзя і вырашэння асноўнай задачы аховы гісторыка-культурнай спадчыны – захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей у мэтах зберажэння і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны і стварэння ўмоў для яе перадачы наступным пакаленням.

4. Для аб’ектаў, якія размешчаны побач або ўваходзяць у склад комплексу або ансамблю, можа распрацоўвацца агульны праект зон аховы.

5. Рэжымы ўтрымання і выкарыстання тэрыторыі ў межах зон аховы з’яўляюцца абавязковымі пры ажыццяўленні горадабудаўнічай, гаспадарчай і іншай дзейнасці.

6. Пры выключэнні гісторыка-культурнай каштоўнасці з Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, а таксама яе перамяшчэнні, праект зон аховы, распрацаваны

ў дачыненні да гэтай гісторыка-культурнай каштоўнасці, не падлягае прымяненню.

## ГЛАВА 2
## ТЭРЫТОРЫЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ. СКЛАД І ПРЫЗНАЧЭННЕ ЗОН АХОВЫ

7. Для забеспячэння захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх навакольнага асяроддзя вызначаюцца тэрыторыя гісторыка-культурнай каштоўнасці і адна або некалькі зон аховы ў адпаведнасці з артыкулам 105 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

Склад зон аховы вызначаецца праектам зон аховы для кожнай гісторыка-культурнай каштоўнасці з улікам яе індывідуальных асаблівасцей і ўмоў размяшчэння ў навакольным асяроддзі.

8. **Тэрыторыя гісторыка-культурнай каштоўнасці** – тэрыторыя, якая непасрэдна занята гісторыка-культурнай каштоўнасцю і (або) звязана з ёй гістарычна і функцыянальна і з'яўляецца яе неад'емнай часткай.

На тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці на падставе дзеючага заканадаўства забяспечваецца магчымасць яе навуковага даследавання, захавання і правядзенне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на гісторыка-культурнай каштоўнасці.

9. **Зоны аховы** – устанаўліваюцца для забеспячэння захаванасці гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе навакольнага асяроддзя, выяўлення яе гісторыка-мастацкай вартасці і выкарыстання з улікам абмежаванняў.

10. **Ахоўная зона** гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – ахоўная зона) – тэрыторыя, якая непасрэдна прылягае да гісторыка-культурнай каштоўнасці і можа ўключаць тэрыторыю гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Ахоўная зона прызначана для забеспячэння захаванасці гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе навакольнага асяроддзя, выяўлення архітэктурна-мастацкай, горадабудаўнічай і планіровачнай якасці гісторыка-культурнай каштоўнасці і найлепшага зрокавага ўспрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці.

11. **Зона рэгулявання забудовы** гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – зона рэгулявання забудовы) – тэрыторыя, неабходная для захавання і (або) рэгенерацыі гістарычна абумоўленай сістэмы планіроўкі, архітэктурнага, прыроднага асяроддзя і прасторавай структуры гісторыка-культурнай каштоўнасці, для замацавання значэння гісторыка-культурнай каштоўнасці ў антрапагенным і (або) прыродным асяроддзі, стварэння неабходных умоў успрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці, рэгламентавання маштабу новага будаўніцтва і рэканструкцыі існуючай забудовы.

12. **Зона аховы ландшафту** гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – зона аховы ландшафту) – тэрыторыя, неабходная для захавання і (або) рэгенерацыі ландшафту.

Зона аховы ландшафту ўключае прыроднае асяроддзе гісторыка-культурнай каштоўнасці, у тым ліку рэльеф, якое ўздзейнічае на цэласнасць успрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці.

13. **Зона аховы культурнага пласта (слоя)** гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – зона аховы культурнага пласта (слоя)) – тэрыторыя, якая прылягае да гісторыка-культурнай каштоўнасці, звязаная з ёй гістарычна і функцыянальна і неабходная для выяўлення, захавання і даследавання археалагічных аб’ектаў. Можа супадаць з тэрыторыяй гісторыка-культурнай каштоўнасці.

14. Тэрыторыя гісторыка-культурнай каштоўнасці, у тым ліку помнікаў археалогіі, зоны аховы, рэжымы іх утрымання і выкарыстання вызначаюцца зыходзячы з аналізу архіўна-бібліяграфічных матэрыялаў гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе гістарычнай тэрыторыі (навуковых даследаванняў), аналізу існуючага палажэння з улікам горадабудаўнічага, антрапагеннага ўплыву на тэрыторыю, асаблівасцей лакалізацыі гісторыка-культурнай каштоўнасці, аналізу існуючых зон аховы (пры іх наяўнасці).

## ГЛАВА 3
## МЕЖЫ, РЭЖЫМЫ ЎТРЫМАННЯ І ВЫКАРЫСТАННЯ ЗОН АХОВЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ

15. Межамі зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці з’яўляюцца ўмоўныя лініі, якія пазначаюць тэрыторыю, за межамі якой ажыццяўленне горадабудаўнічай, гаспадарчай і іншай дзейнасці не аказвае прамога або ўскоснага негатыўнага ўздзеяння на захаванасць гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе гістарычнага асяроддзя.

Межы зон аховы неабходна сумяшчаць з межамі планіровачных або прыродных аб’ектаў: габарытамі кварталаў, вуліцамі, плошчамі, дарогамі, берагамі рэк, ірвамі і ярамі,ляснымі ўзлескамі і іншымі.

16. Для кожнай зоны аховы вызначаюцца рэжымы іх утрымання і выкарыстання, якія прадугледжваюць абмежаванне або поўную забарону дзейнасці, якая стварае пагрозу захаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці і (або) яе навакольнаму асяроддзю.

17. Мяжа **ахоўнай зоны** гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстанаўліваецца зыходзячы з умоў захавання гісторыка-культурнай каштоўнасці і яе найлепшага ўспрымання. У межы ахоўнай зоны ўключаюцца тэрыторыя адкрытай прасторы, прылеглая да каштоўнасці, і ўчасткі з гістарычнай забудовай, ландшафтам.

Ахоўныя зоны помнікаў археалогіі ўстанаўліваюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі артыкула 105 Кодэкса і дадзеных Рэкамендацый.

18. Рэжымамі ўтрымання і выкарыстання ахоўнай зоны забараняецца:

змяненне гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама сістэмы каштоўнай гістарычнай планіроўкі ці яе фрагментаў, каштоўнай архітэктурнай забудовы і прыроднага ландшафту, акрамя магчымасці аднаўлення раней страчаных элементаў і параметраў гісторыка-культурнай каштоўнасці;

пагаршэнне найбольш спрыяльных умоў успрымання, якія выяўляюць вартасці гісторыка-культурнай каштоўнасці;

захаванне дысгарманічных элементаў, што парушаюць цэласнасць успрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці, а таксама павелічэнне іх аб'ёмна-прасторавага архітэктурнага рашэння пры рэканструкцыі;

правядзенне дзейнасці, якая пагражае захаванню гісторыка-культурнай каштоўнасці, рэгенерацыі гісторыка-горадабудаўнічага ці прыроднага асяроддзя;

новае будаўніцтва, за выключэннем аднаўлення страчанай гістарычнай забудовы;

размяшчаць новыя прамысловыя прадпрыемствы, транспартна-складскія і іншыя збудаванні, якія ствараюць транспартныя нагрузкі, вядуць да забруджвання паветранага і воднага басейнаў, з'яўляюцца небяспечнымі ў пажарных адносінах і выбухованебяспечнымі;

будаўніцтва транспартных магістралей і развязак, эстакад, мастоў і іншых інжынерных збудаванняў, якія парушаюць гістарычны вобраз населенага пункта і традыцыйнае прыроднае асяроддзе;

правядзенне гаспадарчай дзейнасці (пры неабходнасці) з дасканалым удакладненнем забароны тыпу і віду дзейнасці.

У ахоўнай зоне могуць выконвацца наступныя віды работ:

звязаныя з захаваннем і аднаўленнем планіроўкі, будынкаў, збудаванняў і добраўпарадкаваннем тэрыторый, якія фарміруюць гістарычнае асяроддзе і акружэнне гісторыка-культурнай каштоўнасці;

звязаныя з упарадкаваннем дарог і дарожак, вонкавага асвятлення, азеляненнем, усталяваннем рэкламных канструкцый, што адносяцца да гісторыка-культурнай каштоўнасці, забеспячэннем іншых форм добраўпарадкавання, выкліканых патрабаваннямі сучаснага выкарыстання, але не парушаючых гістарычна каштоўнае горадабудаўнічае і (або) прыроднае асяроддзе, традыцыйны ландшафт;

звязаныя з рамонтам і рэканструкцыяй інжынерных камунікацый, пракладкай падземных інжынерных камунікацый;

звязаныя з вывадам з ахоўнай зоны і ліквідацыяй або нейтралізацыяй дысгарманічных пабудоў, якія могуць быць заменены будынкамі,

збудаваннямі ці зялёнымі пасадкамі, што не перашкаджаюць захаванню і ўспрыманню гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Праектам зон аховы можа быць прадугледжаны вывад прамысловых прадпрыемстваў, буйных рамонтных майстэрняў і складоў, што прычыняюць фізічныя і эстэтычныя страты гісторыка-культурным каштоўнасцям і (або) выклікаюць значныя грузавыя і транспартныя нагрузкі, прыводзяць да забруджвання глебы, паветра і вадаёмаў.

19. Мяжа **зоны рэгулявання забудовы** вызначаецца зыходзячы з умоў зоны бачнасці гісторыка-культурнай каштоўнасці і візуальнага ўспрымання антрапагеннага і прыроднага асяроддзя ад гэтай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У межы зоны рэгулявання забудовы ўключаюцца тэрыторыі з гістарычнай планіровачнай і аб’ёмна-прасторавай структурай, а таксама з новай забудовай, у залежнасці ад месцазнаходжання асноўных кропак агляду гісторыка-культурнай каштоўнасці і гарадскіх панарам, неабходнасці забеспячэння рэгулявання вышыні і габарытаў новай забудовы (рэканструкцыі існуючай забудовы) на ўсю глыбіню бачнасці, які разгортваецца з гэтых кропак.

Для забеспячэння спрыяльных умоў візуальнага ўспрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх комплексаў неабходна:

не засланяць гісторыка-культурныя каштоўнасці новымі будынкамі ў кропках і зонах найлепшага візуальнага ўспрымання;

пазбягаць размяшчэння ў зоне бачнасці гісторыка-культурных каштоўнасцей новых будынкаў, якія фарміруюць неспрыяльны для ўспрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей фон;

улічваць басейн бачнасці – зону актыўнага ўплыву гісторыка-культурных каштоўнасцей пры ажыццяўленні комплекснай горадабудаўнічай рэканструкцыі тэрыторыі.

Мяжа зоны рэгулявання забудовы вызначаецца на падставе вывучэння архіўна-бібліяграфічных даследаванняў, аналізу дадзеных натурнага даследавання і фатаграфічнай фіксацыяй, якія выяўляюць межы кампазіцыйнага ўздзеяння гістарычных збудаванняў і ансамбляў на навакольнае асяроддзе, а таксама з ўлікам габарытаў новай забудовы, якая не павінна парушаць гістарычнае асяроддзе і адмоўна ўплываць на кампазіцыйную ролю гісторыка-культурных каштоўнасцей.

20. Рэжымы ўтрымання і выкарыстання зоны рэгулявання забудовы вызначаюцца ўмовамі захавання архітэктурнага абрысу гістарычнай часткі населенага пункта і (або) прыроднага асяроддзя, якія акружаюць гісторыка-культурную каштоўнасць, не дапускаюць магчымасць скажэння характару гістарычных планіроўкі, забудовы і (або) ландшафту, ўздзеянне новага будаўніцтва, якое не спрыяе на гісторыка-культурныя каштоўнасці, ансамблі, панараму, іх сілуэт.

Рэжымы выкарыстання зоны рэгулявання забудовы ўлічваюць канкрэтную сітуацыю ўзаемадзеяння гісторыка-культурных каштоўнасцей і новай забудовы.

У зоне рэгулявання забудовы:

захоўваюцца сістэма каштоўнай гістарычнай планіроўкі ці яе фрагменты, каштоўныя збудаванні і элементы ландшафту;

ствараюцца ўмовы, спрыяльныя для зрокавага ўспрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей;

замацоўваецца ці аднаўляецца горадафарміруючае або тэрытарыяльнае значэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей у архітэктурна-прасторавай арганізацыі населенага пункта або ландшафту;

прадугледжваецца ліквідацыя ці нейтралізацыя дысгарманічных элементаў, што парушаюць цэласнасць кампазіцыі гісторыка-культурнай каштоўнасці;

устанаўліваюцца абмежаванні на новае будаўніцтва і рэжымы рэгулявання гаспадарчай дзейнасці;

вызначаюцца патрабаванні па рэканструкцыі існуючай забудовы па вышыні, характару архітэктурных элементаў, працягласці і маштабнасці будынкаў, выкарыстанні будаўнічых матэрыялаў, колераваму рашэнню фасадаў, размяшчэнні вонкавай рэкламы, характару азелянення, прыёмам добраўпарадкавання і іншых характарыстык.

У залежнасці ад гістарычнай вартасці планіроўкі і забудовы, іх месцазнаходжання ў дачыненні да гісторыка-культурных каштоўнасцей і іх значэнні ў фарміраванні асяроддзя распрацоўшчыкам могуць вызначацца асобныя ўчасткі рэгулявання забудовы з рознымі рэгламентамі.

21. Мяжа **зоны аховы ландшафту** ўстанаўліваецца зыходзячы з узаемасувязі гісторыка-культурнай каштоўнасці з прыроднымі гістарычнымі ландшафтамі.

У межы зоны аховы ландшафту ўключаюцца тэрыторыі як натуральна прыродныя, так і тыя, што знаходзяцца пад антрапагенным уздзеяннем, у залежнасці ад ступені ўрбанізацыі тэрыторыі.

У межах зоны аховы ландшафту павінна быць захавана або адноўлена характэрнае прыроднае асяроддзе (рэльеф, водныя сістэмы, сельскі ландшафт і іншае).

22. Рэжымы ўтрымання і выкарыстання зоны аховы ландшафту вызначаюцца ўмовамі захавання гістарычнага ландшафту, які кампазіцыйна звязаны з гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

У зоне аховы ландшафту:

захоўваецца гістарычна каштоўны рэльеф, водныя сістэмы, лясныя масівы, сельскія ландшафты і іншыя прыродныя аб’екты, якія гістарычна звязаны з гісторыка-культурнай каштоўнасцю;

забяспечваецца выяўленне гістарычнай ролі ландшафту ва ўспрыманні гісторыка-культурных каштоўнасцей;

аднаўляюцца лясы, праводзяцца мерапрыемствы па абароне лугавых, берагавых і іншых тэрыторый ад апоўзняў, размыву, умацоўваюцца схілы, яры, праводзяцца іншыя неабходныя прыродаахоўныя мерапрыемствы;

прадугледжваецца ліквідацыя або нейтралізацыя дысгарманічных элементаў ландшафту;

забараняецца будаўнічая і рэгулюецца гаспадарчая дзейнасць.

На тэрыторыі зоны аховы ландшафту дапускаецца гаспадарчая дзейнасць, якая не наносіць шкоды ландшафту і не скажае яго, не патрабуе ўзвядзення новых капітальных пабудоў, якія скажаюць традыцыйнае прыроднае асяроддзе гісторыка-культурнай каштоўнасці. У адпаведнасці з умовамі рэжыму на вызначаных участках зоны аховы ландшафту магчымы сенакос, выпас жывёлы, палявыя, агародныя і іншыя работы, якія не вядуць да змянення навакольнага асяроддзя.

Адкрытыя мясціны і сенажаці могуць быць выкарыстаны для эпізадычных масавых свят і гулянняў без будаўніцтва стацыянарных збудаванняў.

23. У межы **зоны аховы культурнага пласта (слоя)** уключаюцца тэрыторыі, якія ўтрымліваюць матэрыяльныя аб’екты ці іх комплексы, якія ўзніклі ў выніку жыццядзейнасці чалавека ад яго з’яўлення да перыяду новай гісторыі і выяўлены на падставе спецыяльных археалагічных метадаў.

Мяжа зоны аховы культурнага пласта (слоя), выяўленне тэрыторый распаўсюджвання культурнага пласта (слою) ўстанаўліваюцца на падставе разведвальных шурфоў, буравых свідравін ці іншых раскопак, і (або) архіўна-бібліяграфічных звестак.

24. Рэжымамі ўтрымання і выкарыстання зоны аховы культурнага пласта (слоя) неабходна прадугледжваць правядзенне будаўнічых і земляных работ з умовай прыняцця неабходных мер па ахове археалагічных аб’ектаў і артэфактаў у парадку, устаноўленым заканадаўствам, а таксама іншыя меры, якія забяспечваюць ахову культурнага пласту ў залежнасці ад індывідуальных асаблівасцей помніка археалогіі.

25. Для помнікаў археалогіі, размешчаных у межах населеных пунктаў, вызначаюцца ўсе неабходныя зоны аховы, у адпаведнасці з дадзенымі Рэкамендацыямі.

## ГЛАВА 4
## ПАРАДАК РАСПРАЦОЎКІ ПРАЕКТА ЗОН АХОВЫ

26. Праект зон аховы ўяўляе сабой дакументацыю у тэкставай форме з картаграфічным дадаткам (схемай) межаў зон аховы, якая змяшчае апісанне межаў тэрыторыі і зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці, апісанне рэжымаў утрымання і выкарыстання зямель і патрабаванні да горадабудаўнічых рэгламентаў у межах вызначаных зон, распрацаваную на падставе матэрыялаў комплексных навукова-даследчых работ (абгрунтоўваючая частка праекта зон аховы).

27. Заказчыкам работ па распрацоўцы проекта зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці могуць выступаць адпаведныя службы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў або юрыдычныя, фізічныя асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі ў адпаведнасці з пунктам 5 артыкула 105 Кодэкса.

28. Праекты зон аховы распрацоўваюцца як правіла праектнымі арганізацыямі, якія ажыццяўляюць распрацоўку навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях. Распрацоўка праектаў зон аховы для помнікаў археалогіі ажыццяўляецца пры удзеле спецыялістаў, якія адпавядаюць наступным крытэрыям:

маюць вышэйшую адукацыю па спецыяльнасці “Археалогія”, “Гісторыя (археалогія)”;

валодаюць навуковымі практычнымі ведамі, неабходнымі для правядзення археалагічных даследаванняў і падрыхтоўкі навуковай справаздачы аб выкананых археалагічных палявых работах.

29. Вызначаныя згодна з главамі 2 і 3 склад, межы, рэжымы ўтрымання і выкарыстання зон аховы адлюстроўваюцца ў праекце зон аховы згодна з патрабаваннямі главы 5 дадзенай Пастановы.

30. Калі склад або апісанне мяжы гісторыка-культурнай каштоўнасці адсутнічае або не вызначана ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, іх устанаўленне ажыццяўляецца на стадыі распрацоўкі праекта зон аховы на падставе праведзеных навукова-даследчых работ і адлюстроўваецца ў праекце зон аховы.

31. У выпадку выяўлення новых гістарычных звестак, якія мяняюць уяўленне аб характары антрапагеннага і (або) прыроднага асяроддзя, якое акружае гісторыка-культурную каштоўнасць, у праект зон аховы могуць быць унесены змяненні і (або) дапаўненні, шляхам распрацоўкі новага праекта зон аховы (за выключэннем выпадкаў выпраўлення тэхнічнай памылкі) у парадку, вызначаным дадзенымі Рэкамендацыямі.

## ГЛАВА 5
## СКЛАД ПРАЕКТА ЗОН АХОВЫ

32. Праект зон аховы складаецца з абгрунтоўваючай часткі (комплексных навуковых навукова-даследчых матэрыялаў) і зацвярджаемай тэкставай часткі са схемай зон аховы.

33. Абгрунтоўваючая тэкставая частка (навукова-даследчыя матэрыялы) змяшчае наступныя звесткі: пра папярэднія работы і навукова-даследчыя работы; абгрунтаванне межаў тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці і зон аховы, рэжымаў іх утрымання і выкарыстання; неабходныя картаграфічныя матэрыялы, фотаматэрыялы.

Абгрунтоўваючая тэкставая частка можа складацца з наступных раздзелаў:

папярэднія работы;

навукова-даследчыя работы;

межы, рэжымы ўтрымання і выкарыстання зон аховы;

іншыя, неабходныя для абгрунтавання прынятых рашэнняў.

34. Раздзел праекта зон аховы «Папярэднія работы» рыхтуецца з мэтай азнаямлення з гісторыка-культурнай каштоўнасцю і прылеглай да яе тэрыторыі з улікам патрабаванняў дадатку 2 дадзеных Рэкамендацый.

35. Раздзел праекта зон аховы «Навукова-даследчыя работы» рыхтуецца з мэтай падрыхтоўкі навуковага і метадычнага абгрунтавання складу і межаў зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці з улікам патрабаванняў дадатку 2 дадзеных Рэкамендацыі, але дастатковым для навуковага абгрунтавання прынятых праектных рашэнняў.

Раздзел уключае гістарычную даведку, архіўна-бібліяграфічныя і натурныя даследаванні, археалагічныя вышуканні.

36. Раздзел праекта зон аховы «Межы, рэжымы ўтрымання і выкарыстання зон аховы» змяшчае апісанне мяжы тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці або комплексу, вызначаных зон аховы; іх рэжымаў утрымання і выкарыстання з абгрунтаваннем прынятых у праекце рашэнняў; апісанне прывязак межаў зон аховы да антрапагенных і (або) прыродных аб’ектаў, прывязку да геаграфічных каардынат характэрных паваротных кропак у месцах змянення накірунку межаў; удакладненне рэжымаў выкарыстання і ўтрымання тэрыторый зон аховы ў адпаведнасці з канкрэтнымі ўмовамі кожнай зоны або розных іх участкаў.

37. Па выніках праведзеных даследаванняў у праект зон аховы ўключаюцца наступныя карты (схемы) і матэрыялы:

<u>«гісторыка-архітэктурны апорны план»</u>, на якім павінны быць нанесены ўсе нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці, іншыя будынкі і збудаванні, аб’екты, што фарміруюць асяроддзе, у тым ліку сістэмы і элементы планіроўкі, сувязі, якія маюць гістарычную і горадафарміруючую значнасць, традыцыйныя месцы зрокавага

ўспрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці і панарамы забудовы, якая ўключае гісторыка-культурную каштоўнасць;

«схема ландшафтнага аналізу», якая выяўляе існуючыя найбольш значныя элементы і сістэмы ландшафту, існуючыя і (або) страчаныя відавыя сувязі, зону найлепшага візуальнага ўспрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей, адлегласць якой вызначаецца ў залежнасці ад якасці бачнасці ўсіх яе дэталей. Канфігурацыя зоны вызначаецца ў асноўным эмпірычна на месцы і залежыць ад характару рэльефу, планіроўкі, характару навакольнай забудовы і расліннасці. Басейн бачнасці гісторыка-культурных каштоўнасцей і дамінант вызначаецца агульным характарам рэльефу, размяшчэннем гісторыка-культурных каштоўнасцей, дамінант і іх вышынёй. Мяжа басейна бачнасці можа быць вызначана толькі на мясцовасці і пацверджана фотафіксацыяй;

«схема межаў зон аховы» выконваецца на тапаграфічным плане, якая адлюстроўвае мяжу тэрыторыі гісторыка-культурнай каштоўнасці і ўстаноўленыя зоны аховы і ўключае прылеглую да гісторыка-культурнай каштоўнасці тэрыторыю. На схеме таксама адлюстроўваюцца аб’екты, да якіх прывязаныя межы зон аховы. Пры змене накірунку мяжы, лініі неабходна прывязваць да характэрных паваротных кропак з пазначэннем каардынат. Пры неабходнасці карэктнага адлюстравання асноўных элементаў, карта (схема) можа дапаўняцца картай (схемай) большага маштабу для карэктнага адлюстравання неабходных аб’ектаў;

іншыя графічныя матэрыялы, панарамы, перспектывы, разгорткі, фота відавых кропак з натуры, якія характарызуюць працэс развіцця і сучасны стан гісторыка-культурнай каштоўнасці, асяроддзя і тэрыторыі, прылеглай да каштоўнасці.

38. Зацвярждаемая тэкставая частка праекта зон аховы распрацоўваецца на падставе абгрунтоўваючай часткі (навукова-даследчых работ) і складаецца з раздзелаў:

агульныя палажэнні;

тэрыторыя гісторыка-культурнай каштоўнасці;

ахоўная зона;

зона рэгулявання забудовы;

зона аховы ландшафту;

зона аховы культурнага пласта (слоя).

Склад праекта зон аховы вызначаецца на падставе навукова-даследчых работ.

39. Неад’емнай зацвяржаемай часткай праекта зон аховы з’яўляецца дадатак (картаграфічны матэрыял) – схема зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Дадатак распрацоўваецца з улікам патрабаванняў згодна з дадаткам 3 дадзеных Рэкамендацый.

## ГЛАВА 6
## ЗАЦВЯРДЖЭННЕ ПРАЕКТА ЗОН АХОВЫ

40. Праект зон аховы зацвярджаецца пастановай Міністэрства культуры. Рэспублікі Беларусь.

41. Для зацвярджэння праекта зон аховы заказчыкам (або па яго даручэнню распрацоўшчыкам) у Міністэрства культуры накіроўваюцца:

ліст-запыт аб зацвярджэнні праекта зон аховы ў вольнай форме;

ліст-узгадненне праекта зон аховы мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, на тэрыторыі якога размешчана гісторыка-культурная каштоўнасць;

камплект праекта зон аховы на папяровым і электронным носьбіце: зацвярджаемая тэкставая частка (у электронным фармаце .doc або .docx на беларускай мове), графічны дадатак (у электронным фармаце .pdf, на беларускай мове), абгрунтоўваючая тэкставая частка (навукова-даследчыя матэрыялы).

42. Электронная копія пастановы Міністэрства культуры аб зацвярджэнні праекта зон аховы з зацвярджаемай тэкставай часткай і графічным дадаткам накіроўваюцца ў Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь для правядзення абавязковай юрыдычнай экспертызы.

43. У выпадку неабходнасці дапрацоўкі праекта зон аховы Міністэрствам культуры рыхтуецца ліст з вызначэннем прычын адмовы ў зацвярджэнні праекта зон аховы.

44. Пасля зацвярджэння і апублікавання на Нацыянальным прававым Інтэрнет-партале пастановы аб зацвярджэнні праекта зон аховы, Міністэрства культуры не пазней за 5 дзён накіроўвае паведамленне распрацоўшчыку і адпаведнаму мясцоваму выканаўчаму і распарадчаму органу.

45. Пры адсутнасці аднаго або некалькіх дакументаў, адзначаных у п. 41 праект застаецца без разгляду з адпаведным паведамленнем распрацоўшчыка.

Дадатак 1
да Рэкамендацый па складзе і парадку распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей

**Патрабаванні да тэкставых матэрыялаў**

1. Афармленне тэкставых матэрыялаў праекта зон аховы ажыццяўляецца на аркушах фармату А4 (210х297) з наступнымі параметрамі:

палі старонак: верхняе і ніжняе – 2 см, левае – 3 см, правае – 1 см;

шрыфт Times New Roman, звычайны, памер 15 пт;

міжрадковы інтэрвал – адзінарны;

абзац з адступленнем 1,25 см;

выроўніванне па шырыні аркуша і без пераносу слоў;

нумары старонак у цэнтры верхняга калонтытула з адлегласцю 1,0-1,5 см па верхнім краі, памер шрыфту 14 пт (першая старонка не нумаруецца).

2. Тэкст выконваецца на беларускай мове (зацвярджаемай часткі);

3. Электронны варыянт тэкставых матэрыялаў павінен быць у фармаце *.doc або *.docx.

Дадатак 2
да Рэкамендацый па складзе і парадку распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей

**Навукова-даследчыя работы**
**(абгрутоўваючая тэкставая частка)**

1. У ходзе падрыхтоўкі раздзела «Папярэднія работы» ажыццяўляецца:

азнаямленне з дакументацыяй, прадстаўленай заказчыкам;

азнаямленне з праектнай дакументацыяй у арганізацыях горадабудаўнічага профілю, складанне іх пералікаў і зняцце копій;

папярэдняе натурнае азнаямленне з гісторыка-культурнай каштоўнасцю;

вызначэнне тэрыторыі для даследавання, супастаўленне геападасновы з натурай;

папярэдняе вывучэнне літаратурных і графічных крыніц.

2. У ходзе падрыхтоўкі раздзела «Навукова-даследчыя работы» уключаюцца архіўна-бібліяграфічныя і натурныя даследаванні.

3. Па выніках праведзеных архіўна-бібліяграфічных даследаванняў (вывучэнне пісьмовых, літаратурных, архіўных крыніц) складаецца гістарычная даведка, якая змяшчае наступныя матэрыялы:

выпіскі з архіўных і бібліяграфічных крыніц, якія прадстаўляюць пералік гістарычных звестак аб гісторыка-культурнай каштоўнасці;

копіі гістарычных планаў і (або) карт ці іх фрагментаў, пачынаючы з найбольш ранніх, з адлюстраваннем тэрыторый, на якіх размешчаны гісторыка-культурныя каштоўнасці;

гістарычныя натурныя фотаздымкі ці малюнкі асобных будынкаў, збудаванняў, іх комплексаў або ансамбляў, горадабудаўнічых панарам, іншых неабходных для падрыхтоўкі праекта зон аховы адлюстраванняў тэрыторый, якія закранаюцца гэтым праектам;

архіўныя графічныя матэрыялы, фотаматэрыялы, якія даюць уяўленне аб гістарычным развіцці і сучасным становішчы гісторыка-культурнай каштоўнасці на тэрыторыі (населеным пункце);

аналіз гісторыка-архітэктурнага апорнага плану населенага пункта (тэрыторыі), дзе размешчана гісторыка-культурная каштоўнасць;

даследаванне забудовы тэрыторыі (населенага пункта) з вызначэннем горадафарміруючых аб’ектаў і аб’ектаў, якія патрабуюць захаванне,

а таксама аб’ектаў якія парушаюць архітэктурнае адзінства ці ўмовы успрымання гісторыка-культурных каштоўнасцей ці ландшафту;

выяўленне тэрыторый распаўсюджвання культурнага пласта (слою) на падставе разведвальных шурфоў, буравых свідравін ці іншых раскопак,

а таксама бібліяграфічных звестак;

спіс бібліяграфічных, музейных, архіўных і іншых крыніц, якія ўтрымліваюць звесткі аб гісторыка-культурнай каштоўнасці.

4. У ходзе натурных даследаванняў праводзяць візуальнае вывучэнне характару размяшчэння і ўспрымання гісторыка-культурнай каштоўнасці ў натуральных умовах, у тым ліку:

вывучэнне архітэктурных асаблівасцей гісторыка-культурнай каштоўнасці;

даследаванне планіровачнай і прасторавай структуры тэрыторыі, дзе размешчана гісторыка-культурная каштоўнасць, і асаблівасцей яе гістарычнага фарміравання; сістэмы вуліц, плошчаў, дарог, заселеных і незаселеных, занятых раслiннасцю і адкрытых тэрыторый і іх прасторавай арганізацыі, зрокавых сувязей паміж архітэктурнымі комплексамі, сувязі іх з прыродным акружэннем; аналіз ландшафту і своеасаблівасцей абрысу населенага пункта;

даследаванне забудовы населенага пункта – мастацка-гістарычнай каштоўнасці складаючых яго будынкаў і збудаванняў, вызначэнне горадафарміруючага значэння гісторыка-культурных каштоўнасцей, выяўленне аб´ектаў, якія патрабуюць захавання і надання ім статусу гісторыка-культурных каштоўнасцей, а таксама аб’ектаў, што парушаюць архітэктурнае адзінства горадабудаўнічага комплексу або перашкаджаюць візуальнаму ўспрыманню гісторыка-культурных каштоўнасцей або ландшафту;

фотафіксацыю гісторыка-культурнай каштоўнасці ў існуючай сістэме планіровачнай структуры з вызначэннем найбольш значных відавых кропак;

ландшафтны аналіз тэрыторыі – адлюстраванне асаблівасцей прыроднага ландшафту і візуальнага ўспрымання прыродных і архітэктурных дамінант, выяўленне каштоўных і дысаніруючых элементаў;

вызначэнне мяжы культурнага пласта і яго магутнасці на тэрыторыі праектавання на падставе апублікаваных звестак;

апісанне прынцыпаў ацэнкі забудовы, яе тыпалогіі, парадак аднясення тых ці іншых аб’ектаў да дысгарманічных, тлумачэнне прынятых умоўных адзнак, пералік гісторыка-культурных каштоўнасцей, рэкамендацыі па правядзенні неабходных мерапрыемстваў, звязаных з выкарыстаннем нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей, іх асяроддзя, а таксама па ліквідацыі парушэнняў, якія прычыняюць шкоду гісторыка-культурным каштоўнасцям і іх асяроддзю.

5. У залежнасці ад прызначэння карт (схем) на картаграфічных матэрыялах адлюстроўваюцца:

гісторыка-культурныя каштоўнасці, уключаныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь;

каштоўнае гісторыка-архітэктурнае асяроддзе;
шэраговае гісторыка-архітэктурнае асяроддзе;
нейтральная забудова;
дысаніруючая забудова;
археалагічныя аб’екты і (або) тэрыторыі з наяўным культурным пластам;
чырвоныя лініі кварталаў;
напрамкі вуліц, якія захаваліся з мінулага;
межы домаўладанняў;
зялёныя пасадкі, якія захаваліся з мінулага;
мяжа тэрыторыі гістарычнай часткі населенага пункта;
кропкі візуальных панарамных раскрыццяў;
тэрыторыі кварталаў забудовы;
прамыслова-складскія тэрыторыі;
крутыя схілы тэрас і рвоў;
зялёныя пасадкі агульнага карыстання;
назвы населеных пунктаў, вуліц, нумары дамоў, напрамкі назвы дарог;
схемы гістарычных этапаў змянення праекціровачнай і аб’ёмна-прасторавай структуры развіцця і інш.

Дадатак 3
да Рэкамендацый па складзе і парадку распрацоўкі праектаў зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей

**Патрабаванні да картаграфічных матэрыялаў**

1. Кадастравыя ці тапаграфічныя карты:

геападаснова (кадастравая ці тапаграфічная карта) для выканання картаграфічных матэрыялаў павінна быць выкарыстана ў буйным маштабе, дастатковым для забеспячэння адназначнага візуальнага прачытання карты, месцазнаходжання гісторыка-культурнай каштоўнасці, яе элементаў; карэктнага адлюстравання неабходных умоўных пазначэнняў, надпісаў і г.д. (маштаб 1:5000, 1:2000, 1:500);

выкарыстоўваецца актуальная на момант распрацоўкі праектных рашэнняў геападаснова.

2. Маштаб:

неабходна нанясенне колькаснага і (або) лінейнага маштабаў.

3. Каардынаты:

выкарыстоўваецца каардынатная сістэма WGS84;

каардынаты прыводзяцца ў градусах у выглядзе дзесятковага дробу;

рэкамендуецца каардынаты межаў прывязваць да асноўных паваротных кропак і адлюстроўваць ў табліцы або ў асобным дадатку (каардынатнай схеме);

4. Арыентацыя па баках свету:

на карце павінна быць пазначэнне напрамку на поўнач

5. Умоўныя пазначэнні:

выконваюцца ў дастатковым аб’ёме для карэктнага прачытання карты (схемы);

сістэма ўмоўных пазначэнняў павінна быць выразнай, не мець візуальна блізкіх колераў і іншых адметных прыёмаў, пры неабходнасці можа быць выкарыстана сістэма пункціраў (штрыхпункціраў);

рэкамендуецца выкарыстоўваць агульнапрынятае і зразумелае колернае адлюстраванне (вада – сіні, блакітны; лес – зялёны і г.д.).

6. Надпісы на карце (схеме):

назвы і ўмоўныя пазначэнні выконваюцца на беларускай мове, шрыфтам Times New Roman.

7. Электронны варыянт карты (схемы) павінен быць у фармаце *.pdf.